■ Ведай нашых!

У АНСАМБЛІ ТОЛЬКІ ХЛОПЧЫКІ

«Аношкаўскія музыкі» з Нясвіжскага раёна пакарылі Еўропу

Ансамбль гарманістаў «Аношкаўскія музыкі»... Тыя, хто незнаёмы з гэтым фальклорным калектывам, напэўна, уяўляюць, што ў ім сталыя вусатыя мужчыны ў народных строях, вышыванках. Зусім не: яго ўдзельнікі — хлопцы ад 14 да 18 гадоў. Але нягледзячы на юны ўзрост, падлеткі занялі сваю нішу ў народнай творчасці краіны і каторы год утрымліваюць яе. Прычым, што ні выступленне — то новыя ўзнагароды і дыпломы. Нядаўна ўзорны калектыў атрымаў яшчэ і Спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за мэтанакіраваную працу па захаванні нацыянальных мастацкіх традыцый і актыўную канцэртную дзейнасць.

Ансамбль неаднаразова ўдзельнічаў у міжнародных музычных фестывалях і конкурсах, як у Беларусі, так і за яе межамі. За 19 гадоў з дня стварэння калектыву музыкі аб'ездзілі шмат якія рэгіёны Еўропы: пабывалі ў Польшчы, Літве, Германіі, Расіі, Украіне, Францыі, Эстоніі. Хто б думаў, што дзеці з самай глыбінкі стануць вядомыя не толькі ў Беларусі, але і за мяжой.

Таленты самі па сабе не растуць. Іх знаходзяць, выхоўваюць. У дзіцячым садку Аношкаў мастацкім кіраўніком працуе Наталля Антановіч. Яна, як спецыяліст, бачыць, да якой творчасці здольны той ці іншы выхаванец.

Дарога да поспеху была нялёгкай. А пачалася яна яшчэ за савецкім часам, лічыць **дырэктар Аношкаўскай дзіцячай школы мастацтваў Віктар ВЫСОЦКІ.**

З вялікай павагай жыхары аграгарадка Аношкі ўзгадваюць старшыню калгаса «Новае жыццё» Міхаіла Саленіка. Міхаіл Васільевіч, як моцны гаспадарнік, кіраўнік дбаў не толькі аб вытворчых паказчыках, але і аб тым, каб працаўнікі і іх дзеці далучаліся да культуры, каб не ведалі абмежаванняў у імкненні да творчасці. Менавіта ён пабудаваў у 1986 годзе новы калгасны Дом культуры і вырашыў арганізаваць хор. Ды ў гаспадарцы не было добрага спецыяліста, каб яго ўзначаліць. І тады старшыня запрасіў на пасаду кіраўніка Віктара Высоцкага.

— На той час мы з жонкай працавалі ў Нясвіжы, толькі пабудавалі новы дом, — распавёў Віктар Яўгенавіч. — Вядома, не хацелася пераязджаць. Міхаіл Васільевіч кожны дзень на працягу двух гадоў прысылаў па мяне машыну з вадзіцелем, каб адвезці на рэпетыцыі. Менавіта яму належыць ідэя стварэння ў Аношках і дзіцячай школы мастацтваў. Старшыня калгаса выдзеліў пад яе будынак грошы на набыццё музычных інструментаў. З кадрамі дапамаглі мае знаёмыя — кіраўнікі музычных вучэльняў. Мы адкрылі класы баяна, фартэпіяна, духавых інструментаў, па тэорыі музыкі, дзіцячую вакальную групу. Ды хацелася знайсці нейкую «разынку», якая б вылучала нашу школу. І ў 1997 годзе прыйшла ідэя арганізаваць ансамбль гарманістаў.

Вяскоўцам блізкі гэты інструмент, музыка. Здаўна ні адно вяселле, хрэсьбіны не абыходзіліся без добрага гарманіста. Але адна справа стварыць ансамбль і зусім іншая — забяспечыць якасным інструментам, сцэнічным адзеннем, каб касцюм адпавядаў мясцовым народным стылю і традыцыям. Майстрыха з Нясвіжа Алена Хоміч прапанавала саламяныя капелюшы — брылі: лёгкія, зручныя, з невялікім казырком. Паколькі ў ансамбля музыка вясёлая, з запалам, даводзіцца шмат рухацца па сцэне — яны не спадаюць з галавы. Юныя артысты выступаюць у жанры беларускай народнай, а таксама аўтарскай музыкі з выкарыстаннем не толькі гармонікаў, але і іншых народных інструментаў: ударных і духавых — басэтлі, акарыны, жалейкі, беларускай дуды.

Каля вытокаў стварэння калектыву стаяў Віктар Навумчык. А цяпер ім кіруе Аляксей Андросік.

— Аляксей Валер'евіч пасля заканчэння Мінскага каледжа мастацтваў працаваў у суседнім пасёлку Сноў. Калі сышоў кіраўнік «Аношкаўскіх музыкаў», я запрасіў яго ў школу. І вось ужо пяць гадоў ён выкладае і адначасова кіруе ансамблем. Ён, можна сказаць, вырас у гэтым калектыве, ведае ўсю яго кухню, адчувае, што патрэбна гледачу, умее ладзіць з дзецьмі, — кажа Віктар Высоцкі.

— Чым вы ўзялі гледача: народным каларытам, самабытнасцю? — пытаюся ў кіраўніка ансамбля?

— Ёсць шмат калектываў, якія працуюць у народным стылі, але менавіта дзіцячых, на жаль, мала, — адказвае ён.

— «Аношкаўскія музыкі» кранаюць гледача сваім імпэтам, куражом, — дадае Віктар Высоцкі. — Мы вучым дзяцей, што кожнае выступленне павінна даносіць да гледача не толькі нашу беларускую народную культуру, але і пазітыў. Акрамя таго, наша перавага перад іншымі ў тым, што наш ансамбль мабільны. Нам не трэба падключаць апаратуру, мікрафоны. Музыкі могуць іграць і на сцэне, і на вуліцы ў любое надвор'е. У некаторых музычных творах мы выкарыстоўваем прадметы побыту: прасы, пральныя дошкі, вёдры. Усё гэта стварае гармонію паміж мінулым і сучаснасцю.

Таленты самі па сабе не растуць. Іх знаходзяць, выхоўваюць. У дзіцячым садку Аношкаў мастацкім кіраўніком працуе Наталля Антановіч. Яна, як спецыяліст, бачыць, да якой творчасці здольны той ці іншы выхаванец. А выбіраць ёсць з каго: ва ўстанове 143 дзіцяці.

А вось дзяўчынак у ансамбль «Аношкаўскія музыкі» не прымаюць.

— У нас імідж, брэнд мужчынскага калектыву. А калі ўзяць дзяўчат, гэта ўжо будзе нешта зусім іншае, — тлумачаць удзельнікі ансамбля.

— Вы бывалі на гастролях за мяжой, выступалі на розных сцэнічных пляцоўках. А вось на самай галоўнай сцэне краіны — у Палацы Рэспублікі пабывалі ўпершыню. Хваляваліся?

— Напачатку, канешне, хваляваліся. Але пасля некалькіх рэпетыцый супакоіліся. Падчас канцэрта атмасфера была вельмі спрыяльная, нас добра прынялі, апладзіравалі. Значыць, выступленне спадабалася. А гэта лепшая для нас узнагарода, — выказаў агульную думку Арцём Дзеравяга.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

■

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ЗНОЙДЗЕНА ЦЕЛА НАСТАЎНІЦЫ, ЯКАЯ ПРАПАЛА Ў СНЕЖНІ

Больш за месяц у Брэсце родныя, міліцыя, валанцёры шукалі настаўніцу геаграфіі Валянціну Голуб, якая знікла 22 снежня. Жанчына прыйшла ў той дзень у школу, хоць урокаў у яе не было. На рабочым месцы пакінула сумку з дакументамі і грашыма, мабільны тэлефон і недзе выйшла, нібы на хвіліну, каля 14 гадзін дня. З той пары на сувязь ні з кім не выходзіла, пра яе нічога не было вядома.

Пасля заявы мужа ў міліцыю аб прапажы да пошуку падключыліся валанцёры з атрада «Анёл», многія нераўнадушныя гараджане. Праз некаторы час у праваахоўнікаў з'явілася слабая зачэпка ў выглядзе карцінкі адной з вулічных камер відэаназірання. Тэхніка зафіксавала, як Валянціна Голуб галасавала на скрыжаванні вуліц Леніна і Гогаля, спрабуючы спыніць машыну. Міліцыянеры тады звярнуліся да кіроўцаў з просьбай паведаміць, калі хто-небудзь падвозіў жанчыну. Але ніхто не адгукнуўся.

І вось 29 студзеня на пульт дзяжурнага міліцыі патэлефанаваў жыхар аднаго з паўднёвых мікраёнаў горада, які выгульваў сабаку каля берага ракі Мухавец. Мужчына расказаў пра страшную знаходку. Яго сабака знайшоў фрагменты чалавечых пальцаў. Тады супрацоўнікі міліцыі разам з салдатамі батальёна ўнутраных войскаў ачапілі ўказаны раён і прачасалі яго. У выніку ў берагавым зарасніку было знойдзена цела жанчыны, скаванае лёдам.

Як паведаміла **афіцыйны прадстаўнік абласнога ўпраўлення Следчага камітэта Марына ДРАНЬКОВА**, прыкмет гвалтоўнай смерці на целе не выяўлена. Ёсць толькі сляды ўкусаў дзікіх жывёл і птушак, якія, хутчэй за ўсё, і аднеслі пальцы на пэўную адлегласць.

Муж апазнаў жонку. Так стала ясна, што знойдзеная і ёсць 38-гадовая настаўніца, якую доўга шукалі. Супрацоўнікі СК вядуць праверку. Разглядаюцца розныя версіі, у тым ліку і няшчасны выпадак. Паводле слоў Марыны Драньковай, дакладную прычыну смерці можна будзе назваць паводле выніку экспертыз, якія праводзяцца ў рамках крымінальнай справы.

Застаецца сказаць, што ўвесь горад сачыў за інфармацыяй аб пошуку і спачуваў сям'і настаўніцы. Родныя змаглі пахаваць яе акурат да 40-га дня з моманту гібелі.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

БАЦЬКА ЗАБІЎ СЫНА І ДАЧКУ

Целы 17-гадовага юнака і 9-гадовай дзяўчынкі знойдзены з прыкметамі гвалтоўнай смерці ў прыгарадзе Мазыра. Упраўленнем Следчага камітэта па Гомельскай вобласці заведзена крымінальная справа па факце забойства дваіх дзяцей.

Як расказала **афіцыйны прадстаўнік УСК па Гомельскай вобласці Марыя КРЫВАНОГАВА**, 31 студзеня ў дзяжурную часць Мазырскага райаддзела ўнутраных спраў паступіў тэлефонны званок ад 38-гадовага мясцовага жыхара. Мужчына паведаміў, што забіў сваіх дзяцей.

Пры аглядзе кватэры следчыя знайшлі целы забітых брата і сястры. Іх бацька пасля званка ў міліцыю здзейсніў спробу суіцыду: выскачыў з балкона. Ён застаўся жывы і з пашкоджаннямі рознай ступені цяжкасці дастаўлены ў рэанімацыю мясцовай бальніцы. Цяпер следчымі па крымінальнай справе дапытваюцца сведкі, прызначаны шэраг экспертыз.

Па неафіцыйнай інфармацыі, мужчына, які быў афармлены як прадпрымальнік, у момант трагедыі знаходзіўся ў нецвярозым стане. Гавораць, што ў сям'і былі складаныя адносіны паміж сужэнцамі.

Афіцыйныя падрабязнасці трагедыі пакуль не агучваюцца ў інтарэсах следства.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

АБАКРАЎ СВАЯЧКУ НА БУЙНУЮ СУМУ

За крадзеж 14 тысяч долараў, тысячы еўра і ювелірных упрыгажэнняў супрацоўнікі крымінальнага вышуку Ленінскага РУУС сталіцы затрымалі 35-гадовага ўраджэнца Гомеля. Усё гэта мужчына скраў у сваячкі.

Высветлілася, што пацярпелая разам з дачкой у канцы снежня паехала ў абласны цэнтр да радні. Знаходзячыся ў гасцях, жанчына выявіла прапажу ключоў ад сваёй кватэры. А калі вярнулася дадому, недалічылася буйной сумы ў валюце і вырабаў з каштоўнага металу. Праваахоўнікі ўстанавілі, што да злачынства мае дачыненне сужэнец пляменніцы. Ён выцягнуў ключы ад кватэры сваячкі, пасля чаго на сваім аўтамабілі прыехаў у Мінск. Ведаючы, дзе знаходзіцца маёмасць, бесперашкодна зайшоў у кватэру і скраў яе. У момант затрымання падазраваны патлумачыў, што грашовыя сродкі яму былі патрэбныя для аплаты медыцынскіх паслуг. Заведзена крымінальная справа, мужчыну пагражае да 12 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ПРЫСУД ПАКІНУЛІ БЕЗ ЗМЯНЕННЯ

Забойца дзяржінспектара атрымаў пажыццёвае зняволенне

Вызначэннем судовай калегіі па крымінальных справах Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь прысуд судовай калегіі па крымінальных справах Віцебскага абласнога суда ў дачыненні да абвінавачанага Г. пакінуты без змянення, а яго касацыйная скарга і касацыйны пратэст дзяржаўнага абвінаваўцы — без задавальнення. Па сукупнасці злачынстваў, шляхам паглынання менш строгага пакарання больш строгім, канчаткова абвінавачанаму прызначана выключная мера пакарання — пажыццёвае зняволенне ў папраўчай калоніі асаблівага рэжыму без канфіскацыі маёмасці.

11 красавіка мінулага года падчас правядзення кантрольна-палявых мерапрыемстваў па выяўленні і спыненні парушэнняў прыродаахоўнага заканадаўства старшы дзяржаўны інспектар Аршанскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і раслённага свету Генадзь Раўкоў пры нясенні службы, знаходзячыся ў форменным абмундзіраванні з нагрудным знакам і знакамі адрознення, выявіў на тэрыторыі паляўнічых угоддзяў паблізу вёскі Петрашы Талачынскага раёна мужчыну з расчахлёнай і сабранай паляўнічай стрэльбай. Супрацоўнік інспекцыі прадставіўся і правамерна запатрабаваў ад мужчыны спыніцца і прад'явіць адпаведныя дакументы.

Апошні не падпарадкаваўся законнаму патрабаванню і паспрабаваў уцячы. Будучы заспетым, парушальнік з блізкай адлегласці стрэліў у дзяржінспектара з паляўнічай стрэльбы. Пасля гэтага ён збег з месца злачынства і прыняў меры да ўтойвання прылады злачынства. Ад атрыманага агнястрэльнага ранення Генадзь Раўкоў памёр на месцы.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

СКРАЎ 7 ТЫСЯЧ ДОЛАРАЎ

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Маскоўскага РУУС сталіцы шукаюць мужчыну, які падазраецца ў крадзяжы сямі тысяч долараў з офіснага будынка па вуліцы Папова.

Гэтая сума знікла з кабінета дырэктара адной са сталічных транспартных кампаній. У абедзенны час ён ненадоўга выйшаў з яго, не зачыніўшы на замок дзверы. У гэты момант у памяшканне патрапіў зламыснік, які і выцягнуў грашовыя сродкі разам з пашпартам з кішэні курткі пацярпелага. На запісах камер відэаназірання відаць, што падазраваны, перш чым здзейсніць крадзеж, правяраў яшчэ некалькі дзвярэй на прадмет свабоднага доступу ў кабінеты.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*